


# Першы Форум

**У бібліятэчным жыцці рэспублікі прайшло адметнае мерапрыемства – Форум бібліятэкараў Беларусі «Гуманітарна-асветніцкая дзейнасць бібліятэк у кантэксце агульначалавечых каштоўнасцяў і беларускай дзяржаўнасці».**

Паважаныя калегі,
сябры, аўтары і падпісчыкі!

Шчыра віншуем Вас
са святам – Днём бібліятэк!
Жадаем моцнага здароўя,
дабрабыту, поспехаў
ва ўсіх справах,
матэрыяльнай
стабільнасці
і душэўнай
раўнавагі!

Рэдакцыя



Арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Беларуская бібліятэчная асацыяцыя. Менавіта апошняя і з'явілася ініцыятарам правядзення такога вялікага сходу беларускіх бібліятэкараў рознага рангу з усіх рэгіёнаў краіны.











Урачыстае адкрыццё і пленарнае паседжанне адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пры перапоўненай зале. У той жа дзень праведзены круглы стол «Арганізацыйна-прававое і навукова-метадычнае рэгуляванне дзейнасці бібліятэк».

Далейшыя паседжанні Форума прайшлі ў пансіянаце «Рудня» Лагойскага раёна, дзе на трох секцыях выступілі з дакладамі больш за сорак спецыялістаў бібліятэчнай справы: прадстаўнікі Нацыянальнай, публічных гарадскіх, раённых, вузаўскіх, дзіцячых, універсальных абласных, рэспубліканскіх і сельскіх бібліятэк, Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.







# Першы Форум бібліятэкараў Беларусі









У Форуме прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і інфармацыі. Неабходна адзначыць, што па агульнай ацэнцы ўдзельнікаў Форуму арганізацыйны камітэт папрацаваў добра над праграмай, а потым над яе здзяйсненнем. А бібліятэкары рэспублікі выдатна прадставілі сваю дзейнасць у дакладах і прэзентацыях.

По выніках трохдзённай работы была прынята грунтоўна падрыхтаваная рэзалюцыя, якая акрэсліла дзейнасць бібліятэчнай грамадскасці рэспублікі на будучыню.

Форум з'явіўся першай спробай, але стаў цікавай, карыснай, выніковай падзеяй. Бібліятэкары выказалі пажаданне зрабіць такія сходы традыцыйнымі.







